# КРЫВІЯ

Выданьне беларускае дыяспары ў Чэхіі

№13 Сакавік - Травень 2009

Культурна-асьветніцкая газэта

## ЗЬМЕСТ

**Беларуская Чэхія**
Супраць запрашэньня Лукашэнкі - ст. **1**
Зварот да грамадзян Эўропы - ст. **1**
Сьвяткаваньне Дня Волі 2009 - ст. **2**
Канцэрт гурту СТАРЫ ОЛЬСА - ст. **2**
Віншуем з народзінамі - ст. **2**

**Навіны з Бацькаўшчыны**
“Жыве Беларусь! Жыве з Богам”! - ст. **4**
Арышт і штрафы за родную мову - ст. **5**
Не за кошт простых людзей - ст. **5**

**Беларусь у Эўропе**
Дарожная мапа для Беларусі: выбар падыходаў - ст. **7**
У Раду Эўропы толькі з апазіцыяй - ст. **8**
Беларускія дэмакраты будуць засядаць у Эўрапарлямэнце - ст. **8**

**Спорт**
Азаранка выйграла буйны турнір - ст. **9**
Чэмпіёнка сьвету па боксе - ст.**9**

**Беларусы Эўразьвязу**
У Вільні адзначылі 91 угодкі БНР - ст. **10**

**Рознае**
Беларуска - ліцьвінскія шахматы - ст. **11**
Беларусы пачынаюць “пыхцець за Беларусь“ - ст. **12**

## Беларуская Чэхія

### Чэскія беларусы супраць запрашэньня Лукашэнкі ў Прагу

15 лютага 2009 каля Ратушы ў Празе сабраліся каля 30 беларускіх і грузінскіх грамадзкіх актывістаў, каб выказаць пратэст супраць магчымасьці запрашэньня Аляксандра Лукашэнкі на саміт краінаў Эўразьвязу і Ўсходняй Эўропы, які адбудзецца сёлета ў Празе ў траўні.

Акцыя адбылася зь ініцыятывы Моладзевага Руху Беларускага Народнага Фронту “Маладое Адраджэньне”, зарэгістраванага у Чэхіі як міжнародная няўрадавая арганізацыя

На працягу акцыі, якая доўжылася каля гадзіны, удзельнікі распаўсюдзілі каля 200 копіяў звароту беларусаў Чэхіі да грамадзян эўрапэйскіх краінаў. Удзельнікі выказалі пратэст супраць падпісаньня дамовы па агульнай проціпаветранай абароне паміж нелегітымным рэжымам Аляксандра Лукашэнкі і Расеяй”, а таксама супраць рэпрэсіяў у дачыненьні да моладзевых актывістаў у Беларусі. На акцыі прысутнічалі сябра Рады БНР Уладзіслаў Яндзюк, а таксама чэскія журналісты.

### ЗВАРОТ да грамадзян Эўропы

Мы, прадстаўнікі беларускае дэмакратычнае супольнасьці Чэхіі – выказваем рашучы пратэст супраць разгляду запрашэньня на саміт краінаў Эўразьвязу ды ўсходняе Эўропы, які адбудзецца ў Празе ў траўні бягучага года, беларускага дыктатара Аляксандра Лукашэнкі.

Лукашэнку, які незаконна трымае Беларусь ў сваіх руках ужо дзевяць гадоў, нездарма клічуць апошнім дыктатарам Эўропы. Менавіта яго абвінавачваюць міжнародныя праваабарончыя структуры ў выкраданьні і забойствах палітычных апанентаў. Менавіта з уладай Лукашэнкі зьвязаныя тысячы арыштаў і перасьледаў у Беларусі па палітычных матывах, у тым ліку і за апошні год. Заявы нелегітымнае ўлады ў Менску пра тое, што за апошніх

пяць месяцаў яна істотна зьмянілася, ня маюць пад сабою ніякіх лягічных падставаў. Шматлікія арышты і перасьлед апазыцыі працягваюцца. Больш за тое, апазыцыйную моладзь пачалі масава выключаць з ВНУ і зараз жа прымусова прызываць у войска. Нават тых, хто не мае на тое здароўя. Так, толькі за апошні месяц такім чынам апынуліся ў войску пяцёра найбольш актыўных моладзевых апанэнтаў рэжыму.

Беларускія ўлады пад уціскам Расеі рыхтуюцца прызнаць незалежнасьць двух сэпаратысцкіх рэгіёнаў Грузіі, акупаваных расейскім войскам. Тыдзень таму яны ўжо падпісалі з Расеяй дамову аб агульнай супрацьпаветранай абароне – што зьяўляецца супрацьпастаўленьнем амэрыканска-эўрапейскай сістэме ПРА, да якой далучаецца і Чэхія. Гэта значыць, адкрыта супрацьпаставілі сябе Эўразьвязу, у тым ліку і ў ваенным сэнсе.

Тым ня менш, Чэхія, як краіна-старшыня ЭЗ у першую палову 2009 года, можа запрасіць А Лукашэнку на травеньскі саміт. Відавочна, беларускія ўлады ўспрымуць гэта як патураньне й саступ Эўропы прынцыпам і яшчэ больш узмацняць рэпрэсіі ў краіне.

Беспакаранасьць стварае для Лукашэнкі ўмовы ўседазволенасьці. .

**З ДЫКТАТАРАМ ДАМОВІЦЦА НЕМАГЧЫМА!**

Не дапусьціць яшчэ аднае памылкі – мэта нашай сёньнешняй акцыі. Гэта тычыцца ня толькі Чэхіі, але і ўсёй свабоднай Эўропы. Здрада дэмакратычным прынцыпам – першы крок да развалу Эўрапейскага Зьвязу.

**НЕ – ЗАПРАШЭНЬНЮ ДЫКТАТАРА!!!**

Дэмакратычная супольнасьць беларусаў Чэхіі

## Сьвяткаваньне Дня Волі 2009 у Празе

Падрыхтоўка сьвяткаваньня пачалася надзейна: прадстаўнікі суполкі СКАРЫНА сустрэліся з прадстаўнікамі шырэйшае грамады ў новым памешканьні Беларускае Бібліятэкі, каб абмеркаваць супольнае адзначаньне сьвята. Пастанавілі правесьці імпрэзу ў суботу 28-га сакавіка.

Прадстаўнікі СКАРЫНЫ паведамілі, што маюць намер правесьці яе ў прэстыжным рэстаране ля праскага Граду (замку)- з абедам і сьціплай мастацкай часткай. Запрошаныя таксама й ведамыя чэскія палітыкі.

На імпрэзу быццам запрашаюцца ўсе сябры беларускай грамады, з тэй аднак умовай, што арганізатары (СКАРЫНА) маюць права ня ўпусьціць на імпрэзу некаторыя «няпрыязныя» асобы. А каго залічаць да такіх, вызначаць самі арганізатары.

Прадстаўнікі грамады палічылі, што такі падыход супярэчыць усім прынцыпам дэмакратычнае грамадзкае дзейнасьці, і пастанавілі адзначыць сьвяткаваньне асобна ( нажаль, ужо другі год падрад), ад гадз. 18 таго-ж дня. Былі разасланыя запросіны ўсім беларусам Прагі.

Трэба адзначыць, што суполка СКАРЫНА, у сваіх запросінах, падала праграму абедзьвюх імпрэзаў.

Такім чынам, Дзень Волі ў Празе быў адзначаны гэтак:

* Серада 25 сакавіка, 10:00 гадз. і
Субота, 28-га скавіка, 13:00 гадз.
Ушанаваньне памяці старшыняў Рады БНР
на Альшанскіх могілках.

* Субота 28-га сакавіка, 15:00 - 18:00,
Імпрэза суполкі СКАРЫНА - сяброўская
сустрэча з абедам - у рэстаране На Башце
на праскім Градзе.

* Субота 28-га сакавіка, 18:00 - 22:00.
Імпрэза шырэйшай беларускай грамады, з наступнай праграмай:

- Нацыянальны гімн МЫ ВЫЙДЗЕМ ШЧЫЛЬНЫМІ РАДАМІ.
- Прачытаньне Звароту старшыні рады БНР, Івонкі Сурвілы, да беларускага народу.
- Даклад сп-ні Ніны Скеп'ян на тэму дня.
- Канцэрт Сьвятаслава Ліпеня: патрыятычныя і жартаўлівыя песьні.
- Канцэрт Касі Палівада: народныя песьні, рамансы
- Канцэрт госьця зь Беларусі, Цімоха Авіліна: народныя песьні.
- У перапынках між песьнямі была праведзена латарэя ( кошт удзелу: 20 Кч).
- і УЗНАГАРОДА мэдалямі актыўных сяброў грамады.
- Рэлігійны гімн МАГУТНЫ БОЖА



*Сьвятаслаў Ліпень*



*Кася Палівада*

**УРЫЎКІ з дакладу сп-ні Ніны Скеп'ян, кандыдата гістарычных навук:**

*У сваім дакладзе сп-ня Скеп'ян асьвятліла пэрыяд узьнікненьня БНР у 1918 г. і збройнага змаганьня за яе.*



Першым заданьнем ураду БНР было паслаць сваю дэлегацыю ў Вэрсаль (Францыя), дзе тады вырашаліся лесы дзяржаваў і пасьляваеннага ладу Эўропы. Дзякуючы фінансавай дапамозе з боку Ўкраіны, і ня гледзячы на розныя арганізацыйныя праблемы, міністар замежных справаў БНР, Антон Луцкевіч нарэшце трапіў у Вэрсаль - нажаль ужо за позна. Вялікія краіны пасьпелі разрэзаць Эўропу паводля свайго разуменьня, і Беларусь трапіла пад сфэру ўплыву Савецкай Расіі.

... Ува ўмовах акупацыі Беларусі Чырвонай Арміяй, Рада БНР выдае сваю 5-тую Статутную грамату, у якой заклікае да абароны БНР і барацьбы супраць савецкае ўлады.

Толькі ў 1920 г., калі Случчына апынулася ў нэўтральнай зоне і на яе тэрыторыі ня было ні палякаў, ні саветаў, 14-га лістапада пачаў працу Зьезд Случчыны. У яго складзе было 107 дэлегатаў з навакольля Слуцку, а таксама некалькі прадстаўнікоў арміі генэрала Булак-Балаховіча.

На Зьезьдзе была зноў абвешчана легітымнасьць ураду БНР, а таксама ўсеагульная мабілізацыя. Усяго было мабілізавана каля 4000 чалавек.

Слуцкі Збройны Чын быў актыўна падтрыманы Радай БНР, якая даслала ў Слуцак вайсковых спэцыялістаў, а акрамя таго й лекараў, якія памаглі стварыць шпіталь. Атрымалі вайскоўцы й нацыянальны сьцяг з дэвізам «Тым, што пайшлі паміраць, каб жыла Бацькаўшчына.»

... Баявыя дзеяньні пачаліся ў лістападзе 1920 г., доўжыліся амаль месяц і былі даволі пасьпяховыя. Аднак тое, што Чырвоная Армія па дамоўленасьці з польскім бокам мела права перасьледаваць ваякаў і на польскім баку, вельмі пашкодзіла змагаром. Актыўнае змаганьне кончылася тым, што слуцкая брыгада стральцоў перайшла за р. Лань, дзе была раззброеная польскімі ўладамі. Найбольш радыкальныя прыхільнікі барацьбы за незалежнасьць далучыліся да корпусаў генэрала Булак-Булаховіча. Партызанская барацьба на Случчыне цягнулася яшчэ да лютага 1921 г.




*УЗНАГАРОДА*
*за грамадзкую актыўнасьць*

---

**КАНЦЭРТ гурту СТАРЫ ОЛЬСА**

У нядзелю 12-га красавіка 2009
у Literární kavárně Řetězová
гурт Стары Ольса
вельмі ўдала прэзэнтаваў
свой новы альбом
**"Дрыгула"**



У цалкам нефармальнай атмасфэры ўсе жадаючыя маглі задаваць пытаньні ці замаўляць свае любімыя песьні. Былі зайграныя і ўсімі любімыя «Князь Вітаўт», «Ружа-кветка» ды іншыя песьні. Кампазыцыя «У карчме» выклікала ўсплёск пачуцьцяў у публікі, якая гучна чокалася келіхамі і грукала імі па стале. Некаторыя нават ня стрымаліся і пусьціліся ў пляс на стале, які здолеў вытрымаць увесь цяжар беларускага застольнага вясельля.

## ВІНШУЕМ нашых сяброў з НАРОДЗІНАМІ!

**у САКАВІКУ**:
**Ганну Васілевіч, Касю Палівада**
**Юрку Станкевіча, Віталя Воранава**

**у КРАСАВІКУ**:
**Жану Віткоўскую, Кацю Навуменка**

**у ТРАЎНІ**:
**Алесю Вінакураву, Віталя Цімошчанку**
**Андрэя Навуменку**

# НАВІНЫ з Бацькаўшчыны

## “Жыве Беларусь! Жыве з Богам!”

Сёньня ў менскім Палацы культуры трактарнага заводу адбыўся ўстаноўчы зьезд новай палітычнай партыі – Беларускай Хрысьціянскай Дэмакратыі. На ім абраны чатыры сустаршыні партыі: Георгі Дзьмітрук, Віталь Рымашэўскі, Павал Севярынец і Аляксей Шэін.

Таксама прыняты статут і праграма. Кіроўным органам партыі будзе Нацыянальная рада. Найбліжэйшым часам будуць пададзены дакумэнты на рэгістрацыю.

У зьезьдзе ўзялі ўдзел 206 дэлегатаў з 211 вылучаных на зьезд. Дэлегат з Гомелю Кастусь Жукоўскі ня змог прыехаць, бо адбывае адміністрацыйны арышт. Некаторых затрымлівала міліцыя па дарозе ў Менск, іншых улады спрабавалі запалохаць. Нягледзячы на перашкоды, устаноўчы зьезд партыі БХД адбыўся. Заля была ўпрыгожана сымбалямі БХД – бэтлеемскай зоркай на фоне бел-чырвона-белага сьцяга, а таксама лёзунгам “Хрысьціянскія прынцыпы, Беларускі патрыятызм”. Дэлегаты скандавалі “Жыве Беларусь! Жыве з Богам!”. Паэт Уладзімер Някляеў перадаў свой верш “Сьцяг”, які можа стаць гімнам партыі.

У сваім выступе на зьезьдзе **Павал Севярынец** адзначыў:

“БХД паклікана шукаць цьвёрдае апірышча для ўсёй нацыі і ўсёй краіны. Для гэтага мы павінны запрашаць для ўдзелу ў грамадзкай дзейнасьці і палітыцы дзесяткі тысячаў людзей, якія вераць у Бога і любяць Беларусь. Для нас вельмі важна быць маральнай базай для перамен. Таму БХД мусіць быць партыяй маралі. БХД – гэта не апазыцыя, а гэта альтэрнатыва. Для нас найгалоўнейшай задачай зьяўляецца давесьці Беларусі і беларусам як можна жыць лепш, калі не баісься, не хлусіш, не крадзеш. Калі верыш і любіш. БХД – гэта партыя перамогі. Мы верым, што Беларусь будзе жыць паводле свабоды, праўды і справядлівасьці”.



*Павал Севярынец*

Аргкамітэт працаваў амаль чатыры гады і да яго далучыліся больш за тысячу грамадзянаў.

За апошнія дзесяць гадоў гэта ўжо другая спроба зарэгістравацца. Паводле Віталя Рымашэўскага, БХД – гэта не рэлігійная арганізацыя, хаця 31% сяброў зьяўляюцца пратэстантамі, амаль 45% - праваслаўнымі і каля 13% каталікамі. Таксама да працы далучыліся і прадстаўнікі іншых веравызнаньняў. Спадар Рымашэўскі адзначыў, што беларуская хрысьціянская дэмакратыя заклікана зьяднаць беларускае грамадзтва.

**Віталь Рымашэўскі**

“БХД – партыя, якая паклікана аб’яднаць правацэнтрысцкія дэмакратычныя сілы Рэспублікі Беларусь. Мы пакліканы не толькі нагадаць пра сапраўдныя каштоўнасьці ў беларускай палітыцы, пра тое, што супраца дэмсілаў магчыма толькі на супольных каштоўнасьцях – дэмакратыя, павага да правоў чалавека, эўрапейскі выбар і незалежнасьць Беларусі. І стратэгічная мэта ў супрацы з нашымі палітычнымі партнэрамі вылучэньне адзінага кандыдата на наступных прэзыдэнцкіх выбарах”.




*Віталь Рымашэўскі*

Сваімі бліжэйшымі паплечнікамі хрысьціянскія дэмакраты называюць рух “За свабоду” і БНФ. З прывітальным словам да зьезду выступілі палітыкі Аляксандар Мілінкевіч, Аляксандар Казулін, Лявон Баршчэўскі, Анатоль Лябедзька, Мікола Статкевіч, Зьміцер Дашкевіч. Паводле Аляксандра Мілінкевіча, БХД хутка стане ўплывовай сілай краіны.

**Аляксандар Мілінкевіч**

“Вы, хрысьціянскія дэмакраты, павінны вярнуць у нашае незалежнае грамадзтва дух любові, сілу любові. Перад намі стаіць задача зьмяніць дух нашага грамадзтва. Вы павінны вярнуць дух і веру. І вашай місіяй будзе вярнуць беларускі патрыятызм. Нам вельмі важна эўрапеізаваць краіну. Давайце памятаць для чаго мы працуем і што ахвяруем. Каб беларуская ўлада стала нашай уладай, каб у Беларусі стала ўлада маральнай і ўладай ад Бога. Гэта сьвятая задача і мы яе выканаем разам”.

**Анатоль Лябедзька** перадаў лідэрам БХД папку Вярхоўнага Савету Беларусі 13-га скліканьня:

“Гэта быў сымбаль таго, што я перадаю папку апошняга законнага парлямэнту краіны ў рукі людзям, якія прыйдуць у сапраўдны беларускі парлямэнт, каб рабіць эўрапейскую, заможную, багатую Беларусь”.

Вітаньні зьезду партыі БХД перадалі таксама хрысьціянскія дэмакраты Нямеччыны, Галяндыі, Нарвэгіі, Фінляндыі і іншых эўрапейскіх краінаў. Дэпутатка Парлямэнцкай асамблеі Рады Эўропы ад Нарвэгіі ў сваім выступе адзначыла, што ў беларускіх уладаў няма ніякіх падставаў, каб не зарэгістраваць партыю БХД.

**Алесь Дашчынскі,** Радыё СВАБОДА, 28.2.2009

## Арышт і штрафы за родную мову

23 лютага 2009 г. у судзе Цэнтральнага раёну Гомеля разглядалі справы чатырох удзельнікаў акцыі ў абарону беларускай мовы, праведзенай 21 лютага — у Міжнародны дзень роднай мовы. Аднаго арыштавалі, на траіх наклалі буйныя штрафы.

Кастуся Жукоўскага, каардынатара нова-створанай партыі "Беларуская хрысьціянская дэмакратыя", судзьдзя Марына Дамненка пакарала арыштам на 7 сутак. Капітан міліцыі Шукель, выкліканы на паседжаньне з Цэнтральнага райаддзелу міліцыі, літаральна выштурхнуў спадара Жукоўскага з будынку суду, каб везьці ў ізалятар адбываць суткі.

Арыштаваны толькі й здолеў выгукнуць, што з выракам ня згодны:

"Гэта ганьба, ганьба за беларускую мову. Але мы ўсё роўна пераможам!"

Кастусь ды іншыя маладыя гамельчукі ў дзень роднай мовы ішлі па вуліцы Савецкай, каб ускласьці кветкі да помніка праваслаўнаму асьветніку Кірылу Тураўскаму. Апрача гвазьдзікоў, у руках яны трымалі аркушы паперы, памерам 20 на 30 сантымэтраў, з надпісамі "Родная мова" й сінім штампам па-расейску: "Запрещено". Раты ў маладзёнаў былі завязаныя чырвона-зялёнымі стужкамі.

Па дарозе да помніка міліцыянты з роты хуткага рэагаваньня палку патрульна-паставой службы абласной міліцыі, апранутыя ў чорныя цывільныя курткі, схапілі сямёх удзельнікаў акцыі й завезьлі ў Цэнтральны РАУС. Да іх далучылі й дваіх журналістаў. У пастарунку трымалі каго чатыры, а каго амаль шэсьць гадзінаў. На ўсіх склалі адміністрацыйныя пратаколы за "парушэньне правілаў правядзеньня вулічных акцый", якія й накіравалі ў суд.

Аштрафаваная на 1 мільён 750 тысяч рублёў мастак-дызайнэр Марыся Тульжанкова так пракамэнтавала затрыманьні й прысуды:

"Мы як грамадзяне мелі права на сваё слова, на ўскладаньне кветак. Пакуль жа яшчэ не было забароны на ўскладаньне кветак.

Гэта незаконна, абсалютна незаконна. Гэта — суд над роднай мовай! Рэальна мы як грамадзяне мелі права на сваё слова, на ўскладаньне кветак. Пакуль жа яшчэ не было забароны на ўскладаньне кветак. Тое, што нас затрымалі незаконна, не назвалі сябе, зацягнулі ў аўтобус — гэта парушэньне нашых правоў. Гэта ўвогуле гвалт".

Што ў Гомелі існуюць вялікія праблемы зь беларускай мовай, паказаў ня толькі суботні флэш-моб, але й сёньняшнія судовыя разборы. Судзьдзі беларускай мовы ня ведаюць. Марына Дамненка наагул адхіліла патрабаваньне спадарыні Тульжанковай весьці разбор на беларускай мове, спасылаючыся на тое, што ў мінулым годзе тая пісала скаргу на рашэньне суду па-расейску. І калі дзяўчына ўвогуле адмовілася адказваць на пытаньні, судзьдзя абвясьціла перапынак, каб выклікаць з унівэрсытэту ў суд перакладчыка з расейскай мовы на беларускую.

Прадстаўнік Беларускага Хэльсынскага камітэту Алесь Яўсеенка, які прысутнічаў на разглядзе адміністрацыйных спраў за акцыю ў абарону роднай мовы, лічыць, што моладзь трапна абазначыла праблему:

Беларуская мова — дзяржаўная. Як жа можна адмаўляць у хадайніцтве весьці разбор на дзяржаўнай мове?!

"Рашэньні суду паказваюць рэпрэсіўны характар прымяненьня заканадаўства. Улады не перабудоўваюцца, нягледзячы на дэкларацыі прэзыдэнта. Праблемы існуюць і з мовай. У нашым паўмільённым горадзе няма ніводнай беларускамоўнай школы. Ёсьць адна гімназія № 36 імя Івана Мележа, але й там толькі палова клясаў беларускія.

Самымі судамі ня выконваецца закон аб мовах. Беларуская мова — дзяржаўная. Як жа можна адмаўляць у хадайніцтве весьці разбор на дзяржаўнай мове?!"

Марына Дамненка пакарала таксама штрафам на 1 мільён 750 тысяч рублёў удзельніка акцыі Васіля Такарэнку. Судзьдзя Алена Цалкова аштрафавала на 700 тысяч рублёў студэнта Алеся Вярцейку, які выпадкова далучыўся да акцыі.

Разгляд адміністрацыйных спраў у дачыненьні да сяброў БАЖ Зьмітра Кармазіна й Алега Рыжкова перанесены на заўтра — яны запатрабавалі адваката.

Астатнія ўдзельнікі акцыі ў абарону роднай мовы чакаюць позваў у суд.

**Крыніца:** Радыё Свабода (Гомель)

## НЕ ЗА КОШТ ПРОСТЫХ ЛЮДЗЕЙ

Партыя БНФ выступіла супраць намеру ўладаў перакласьці цяжар наступстваў іх неэфектыўнай палітыкі і сусьветнага эканамічнага крызісу на плечы беларускага народу. Падчас брыфінгу, які адбыўся 11 лютага на сядзібе партыі, старшыня БНФ Лявон Баршчэўскі і яго намесьнікі Вінцук Вячорка і Віктар Івашкевіч агучылі прапановы па абароне людзей ад сацыяльных наступстваў эканамічнага крызісу.

**Лявон Баршчэўскі** адзначыў, што планаваная партыяй акцыя 25 сакавіка будзе праходзіць на фоне паглыбленьня эканамічнага крызісу.

" Незалежнасьць – гэта першы акцэнт, - сьцьвярджае старшыня БНФ. – Але сацыяльныя моманты таксама вельмі важныя."

**Вінцук Вячорка** акцэнтаваў увагу на тым, што праблема зьберажэньня такой каштоўнасьці, як незалежнасьць, ня згубіла сваёй вастрыні. На ягоную думку, апошнім часам крокі кіраўніцтва краіны паказалі, што яно не адмаўляецца ад залежнасьці і стварэньне Саюзнай дзяржавы ёсьць замацаваньнем менавіта залежнасьці, а таксама вытаргоўваньнем "гэшэфтаў" дзеля зберажэньня ўлады.

- БНФ абараняе людзей ад дзеяньняў улады, якая абкрадае іх, прыкрываючыся сусьветным крызісам, - зазначыў Віктар Івашкевіч. – Паўтараецца схема, апрабаваная ўладай у 90-х гадах. Крэдыты

трацяцца невядома на што. Пасьля першай апэрацыі абкрадання "разавая дэвальвацыя" перайшла да "дэвальвацыі паўзучай". БНФ выступае супраць такой палітыкі.

Старшыня камісіі БНФ па сувязях з грамадзкасьцю Вацлаў Арэшка зьвярнуў увагу на тое, што захады да лібэралізацыі эканомікі неэфектыўныя без лібэралізацыі палітычнага жыцьця.

Як адзначыў першы намесьнік старшыні Вінцук Вячорка, савет, створаны пры прэзідэнце краіны, структура фантомная.

Лявон Баршчэўскі выказаў пазіцыю БНФ у адносінах да так званага дыялогу дэмакратычных сілаў з уладамі:

- Нельга да абеду засядаць у савеце, а пасьля - выступаць з лозунгамі супраць рэжыму. Гэта няшчыра ў адносінах да людзей.

- Мы хочам, каб улада села з намі за стол перамоваў. Мы гатовыя весьці канкрэтныя перамовы, а ня быць дарадцамі, - адзначыў Віктар Івашкевіч.

**Прапановы Партыі БНФ аб першачарговых захадах па абароне людзей Беларусі ад сацыяльных наступстваў эканамічнага крызісу**

Дзеля таго, каб абараніць народ Беларусі ад сацыяльных наступстваў эканамічнага крызісу, Партыя БНФ прапануе неадкладна ажыцьцявіць наступныя захады:

• Рэгулярна праводзіць індэксацыю заробкаў, пэнсій і стыпендый дзяржаўных служачых, работнікаў прадпрыемстваў дзяржаўнага сэктару і навучэнцаў, адпаведна росту кошта рэальнага спажывецкага кошыку.

• Выплачваць выходную дапамогу работнікам, якіх звальняюць, у памеры паўгадавога заробку за кошт дзяржавы.

• Аплочваць за кошт дзяржавы навучаньне на курсах перакваліфікацыі.

• Зьмяншаць спажывецкія цэны на бэнзын і іншыя нафтапрадукты, адпаведна сучасным сусьветным коштам.

• Увесьці сыстэму льготнай падтрымкі для вучнёўскай моладзі (як гэта робіцца ва ўсім цывілізаваным сьвеце).

Для таго каб зьменшыць пагрозу беспрацоўя ў дзяржаўным сэктары неабходна стымуляваць стварэньне новых працоўных месцаў у прыватным сэктары. Дзеля гэтага:

• Адмяніць усе падаткі і плацяжы для новаст792ораных камэрцыйных арганізацый і прадпрымальнікаў на працягу першых 2 год дзейнасьці.

• Адмяніць ліцэнзаваньне відаў эканамічнай дзейнасьці, якія не нясуць непасрэднай пагрозы жыцьцю і здароўю людзей.

• Зьняць усе абмежаваньні па найму работнікаў для індывідуальных прадпрымальнікаў.

• Адмяніць плянавы характар штрафаў як артыкулу бюджэтных паступленьняў.

• Адмяніць абмежаваньні на рост заробкаў у камэрцыйных прадпрыемствах, якія не карыстаюцца дзяржаўнымі датацыямі.

Дзеля забясьпячэньня праграмаў сацыяльнай абароны грамадзянаў і не дапушчэньня абясцэньваньня грашовых накапленьняў і рэзкага росту цэнаў неабходна правядзеньне палітыкі жорсткай бюджэтнай эканоміі. Неабходныя крокі:

• Перадаць у дзяржаўны бюджэт закрыты прэзыдэнцкі фонд.

• Скараціць выдаткі рэспубліканскага і тэрытарыяльных бюджэтаў ня менш чым на 40% наступным шляхам:

- колькасна скараціць апарат (у першую чаргу кантрольных органаў і пазаканстытуцыйных сілавых структур);

- спыніць дзяржаўнае фінансаваньне так званай ідэалягічнай вэртыкалі і БРСМ;

- усталяваць мяжу максімальнага заробку для дзяржаўных службоўцаў і работнікаў прадпрыемстваў, якія атрымліваюць дзяржаўныя датацыі, 500 эўра;

- замарозіць дзяржаўнае фінансаваньне будаўніцтва і падтрымкі непрыбытковых аб'ектаў, якія ня маюць першачарговай сацыяльнай значнасьці (лядовыя палацы, "лінія Сталіна", аграгарадкі і г.п.).

• Увесьці парадак штогадовага публічнага дэкляраваньня даходаў усіх буйных дзяржаўных службоўцаў (кіраўнікі выканкамаў, міністэрстваў, ведамстваў, дырэктараў дзяржпрадпрыемстваў і г.д.).

• Прыняць часовы (на 2009-2011 гг.) парадак налічэньня пэнсій з разьліку 8 (для асобаў з асабліва цяжкімі ўмовамі працы – 10) у.а. за год працоўнаа стажу.

Партыя БНФ рашуча выступае супраць намеру ўладаў перакласьці цяжар наступстваў іх неэфэктыўнай палітыкі і сусьветнага крызысу на плечы беларускага народу. ПБНФ лічыць, што без прыцягненьня заходніх інвэстыцыяў і далучэньня да эўрапейскіх праграмаў разьвіцьця, Беларусі немагчыма захаваць адпаведныі жыцьцёвы ўзровень людзей і выратаваць эканоміку. Шлях лібэралізацыі эканомікі і супрацоўніцтва з Эўропай немагчымы без дэмакратызацыі палітычнага жыцьця ў Беларусі. Дзейная ўлада паказвае сваю няздольнасьць да дэмакратычных рэформаў. Таму мы заклікаем да правядзеньня нечарговых свабодных выбараў.

**Радыё Рацыя,** 11.2.2009

## 9 беларускіх гарадоў атрымаюць бязьвізавы рэжым зь Летувой (Літвой)

Гэта Горадня, Ліда, Астравец, Ашмяна, Смургоні, Шчучын, Мядзел, Паставы і Браслаў.

Пра гэта Еўрарадыё паведаміла прэс-аташэ беларускай амбасады ў Летуве.

Як паведамляла Еўрарадыё, зону спрошчанага памежнага пераходу плануецца ўвесьці для жыхароў Беларусі і Летувы. Яна расьцягнецца на 50 кіламетраў у абодва бакі ад дзяржаўнай мяжы. Жыхары прыгранічча змогуць наведваць суседнюю краіну бязь візаў — па спэцыяльных пасведчаньнях.

**Павел Кміціч,** Euroradio, 9 красавіка 2009 г.

# ДАРОЖНАЯ МАПА ДЛЯ БЕЛАРУСІ: ВЫБАР ПАДЫХОДАЎ

31 сакавіка ў Брусэлю з ініцыятывы трох найбуйнейшых фракцыяў Эўрапарлямэнту адбылася аднадзённая канфэрэнцыя, якая была цалкам прымеркаваная вызначэньню палітыкі Эўразьвязу ў дачыненьні да Беларусі.

З уводзінамі да асноўных дыскусіяў выступілі лідэры Эўрапейскае Народнае Партыі – Эўрапейскіх Дэмакратаў, Партыі Эўрапейскіх Сацыялістаў ды Эўрапейскага Задзіночаньня Лібэральных Дэмакратаў, а з абагульненым дакладам выступіў старшыня Эўрапарлямэнту Ганс-Гэрт Пёттэрынг.

Са зьместу дыскусіяў вынікала адрознае стаўленьне Эўрапарлямэнту з аднаго боку ды выканаўчых структураў Эўразьвязу з іншага боку, прадстаўленых кіраўніком генэральнага дырэктарату вонкавых дачыненьняў. Менавіта гэтыя пазіцыі мусіць ўзважыць Рада Эўрапейскага Зьвязу ў выглядзе найвышэйшых ўрадавых прадстаўнікоў кожнае з краінаў-чальцоў перад самітам, які адбудзецца ў Празе 7 траўня. Як ведама, праскі саміт Эўразьвязу павінен дэкляраваць прынцыпы новага ўзроўню супрацоўніцтва з яго суседзямі, сярод якіх ёсьць і Беларусь. Асноўнай перашкодай на шляху да паўнавартаснага ўдзелу Беларусі ў праграме Ўсходняга партнэрства, якая будзе прэзэнтаваная падчас саміту краінаў Эўразьвязу ў Празе, зьяўляецца сумнеў у ажыцьцяўленьні дыктатарскім рэжымам А. Лукашэнкі неабходных крокаў да палітычнай лібэралізацыі, дэмакратызацыі законадаўства ды трансфармацыі эканомікі да рынкавых ўмоваў.

Чалец фракцыі Партыі Эўрапейскіх Сацыялістаў нідэрляндзкі дэпутат Ян Марынус Вірсма, які актыўна працаваў у камітэце Эўрапарлямэнту па справах Беларусі, выказаў ўпэўненасьць у мэтазгоднасьці ўвядзеньня эканамічных санкцыяў, накіраваных на істотнае абмежаваньне прыбыткаў найвышэйшых прадстаўнікоў рэжыму Лукашэнкі ад дзейнасьці беларускіх дзяржаўных прадпрыемстваў. Доўгатэрміновая палітычная ізаляцыя рэжыму Захадам прынесла адпаведныя пазытыўныя вынікі і прымусіла Лукашэнку зрабіць пэўныя саступкі ў выглядзе вызваленьня палітычных зьняволеных, а таксама дазволу на продаж і падпіску газэтаў "Народная Воля" і "Наша Ніва" праз дзяржаўную сістэму распаўсюду друкаваных выданьняў.

Кансалідаваныя падыходы ды аб'ектыўная ацэнка сучаснай сітуацыі ў Беларусі былі прадстаўленыя беларускімі ўдзельнікамі канфэрэнцыі, сярод якіх былі лідэр грамадзкага Руху "За Свабоду" Аляксандар Мілінкевіч, старшыня Аб'яднанае Грамадзянскае Партыі Анатоль Лябедзька, кіраўніца Беларускае Асацыяцыі Журналістаў Жана Ліцьвіна, сустаршыня партыі Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя Віталь Рымашэўскі ды старшыня незалежнага Зьвязу Палякаў у Беларусі Анжэліка Борыс. Галоўны прынцып для разьвіцьця далейшага супрацоўніцтва паміж Эўразьвязам і Беларусяй, прапанаваны беларускімі ўдзельнікамі канфэрэнцыі, палягае ў тым, каб прымусіць рэжым Лукашэнкі ўлічваць інтарэсы грамадзянаў, якія не пагаджаюцца з палітыкай уладаў. Падчас канфэрэнцыі неаднаразова падкрэсьлілася неабходнасьць удзелу беларускай палітычнай апазіцыі ды грамадзянскай супольнасьці ў фармаваньні праграмы ды ўмоваў супрацоўніцтва Эўразьвязу і Беларусі. На адным з папярэдніх мерапрыемстваў, арганізаваным Эўрапарлямэнтам і прысьвечаным Беларусі, сябра Рады Беларускае Народнае Рэспублікі Янка Жучка выказаў зьдзіўленьне тым, што беларуская мова не ўваходзіць у лік працоўных моваў канфэрэнцыі па Беларусі. А гэтым разам недахоп быў выпраўлены і сінхронны пераклад зь беларускай і на беларускую мову быў наладжаны.

Высновы, зробленыя беларускімі й замежнымі дакладчыкамі ў справах рэфармаваньня крымінальнага й выбарчага кодэксаў Беларусі, закону пра мэдыі, умовы для палітычнай дзейнасьці ды свабоды асацыяцыяў, свабоды веравызнаньня ды правоў нацыянальных меншыняў, не дазваляюць засьведчыць імкненьне антыбеларускага рэжыму да дзеяньняў ў накірунку дэмакратычнай трансфармацыі нашай краіны.

Разам з ацэнкай дзеяньняў рэжыму Лукашэнкі былі акрэсьленыя недахопы ў палітыцы Эўразьвязу ў дачыненьні да Беларусі. Старшыня Руху "За Свабоду" Аляксандар Мілінкевіч назваў несправядлівым рэгуляваньне выдачы Шэнгенскіх візаў для грамадзянаў Беларусі, якія вымушаны плаціць за візы ўдвая большы за грамадзянаў Расеі ды Ўкраіны консулярны ўнёсак у 60 Эўра. Сустаршыня Рады Аб'яднаных дэмакратычных сілаў Анатоль Лябедзька крытыкаваў неэфэктыўную палітыку Арганізацыі па Бясьпецы й Супрацоўніцтве ў Эўропе, якая з 2000 году дазваляе "дэпутатам" незаконна прызначаемай рэжымам Лукашэнкі гэтак званай Палаце прадстаўнікоў афіцыйна прадстаўляць Беларусь у Парлямэнцкай Асамблеі АБСЭ. АБСЭ, паводле Анатоля Лябедзькі, ўжо восем гадоў запар тлумачыць прысутнасьць дэлегацыі гэтак званае Палаты прадстаўнікоў у сваёй Парлямэнцкай Асамблеі стварэньнем падмурку для дыялёгу з рэжымам, які альбо ўвогуле не адбываўся альбо ня меў ніякіх практычных вынікаў.

Да апошняга моманту ня быў пацьверджаны ўдзел ў вызначальнай канфэрэнцыі прадстаўнікоў уладаў Беларусі. Урэшце канфэрэнцыю наведаў амбасадар Беларусі ў Бэльгіі Ўладзімер Сенька, які выступіў з заклікам пашырыць фармат дачыненьняў Эўразьвязу з афіцыйным Менскам без папярэдніх перадумоваў і патрабаваньняў, кіруючыся выгодамі ад перспэктыўнага супрацоўніцтва.

Сябра Рады Беларускае Народнае Рэспублікі Зьміцер Піменаў зьвярнуў увагу ўдзельнікаў канфэрэнцыі на пасьлядоўны этнацыд ў дачыненьні да беларусаў, які ажыцьцяўляе рэжым Лукашэнкі праз закрыцьцё беларускіх школаў і перасьлед за карыстаньне беларускай мовай. Спадар Піменаў

таксама выказаў пратэст супраць прыярытэту прагматычнага падыходу Эўразьвязу ў дачыненьні з дыктатурай, што супярэчыць эўрапейскім маральным каштоўнасьцям і правам чалавека. Прысутныя на канфэрэнцыіі атрымалі і з зацікаўленьнем чыталі інфармацыйны бюлетэнь Беларуска-Эўрапейскага Задзіночаньня (зьмест бюлетэня пададзены ніжэй).

У часе дэбатаў яскрава акрэсьлілася сапраўднае стаўленьне антыбеларускага рэжыму да сваіх грамадзянаў, калі амбасадар Беларусі сказаў на адрас прысутных у залі паседжаньняў сваіх суграмадзянаў у замежжы, сярод якіх былі сябра Рады БНР Зьміцер Піменаў і старшыня Моладзевага Руху Беларускага Народнага Фронту "Маладое Адраджэньне" Раман Кавальчук, што зь імі яму няма пра што размаўляць і нешта зь імі абмяркоўваць. Відаць, гэткая рэакцыя тлумачыцца тым, што палітычныя апанэнты рэжыму ў Беларусі трапляюць пад рэпрэсіі ці знаходзяцца пад кантролям уладаў, а за мяжою ўсё ж цяжэй арганізаваць іх перасьлед. Пазьней у кулюарах супрацоўнік амбасады Беларусі, які браў удзел у канфэрэнцыіі разам з Уладзімерам Сенькам, у абразьлівай форме зьвярнуўся да лідэра беларускіх палітычных уцекачоў, злучаных у Беларуска-Эўрапейскае Задзіночаньне, Зьмітра Піменава. Гэткае зьняважлівае стаўленьне прадстаўнікоў антыбеларускага рэжыму да сваіх апанэнтаў у Брусэлю цалкам упісваецца ў кантэкст з апошнімі ненавіснымі выказваньнямі Лукашэнкі на адрас апазіцыіі ды сьведчыць пра імітацыю памкненьняў да дэмакратычных пераменаў і дыялёгу з Эўрапейскім Зьвязам.

## У Раду Эўропы – толькі разам з апазіцыяй

Прадстаўнікі Парламенцкай асамблеі Рады Эўропы прапануюць, каб Беларусь у гэтай структуры прадстаўляла зьмяшаная дэлегацыя. У яе склад павінны ўвайсьці як прадстаўнікі афіцыйнай улады, так і апазіцыі. Пра гэта было заяўлена 17 лютага падчас сустрэчы лідэраў дэмакратычных сіл Беларусі з дэлегацыяй ПАСЕ у Менску.

Беларусь была пазбаўленая статусу спецыяльнага запрошанага ў Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы яшчэ ў 1997 годзе пасьля правядзеньня Лукашэнкам канстытуцыйнага рэферэндуму, які ня быў прызнаны на Захадзе. Некаторы час у ПАСЕ Беларусь прадстаўлялі дзьве дэлегацыі – Вярхоўнага Савету і створанага пасля рэферэндуму Нацыянальнага сходу. Цяпер, калі на тое будзе згода абодвух бакоў, сітуацыя можа паўтарыцца. Як паведаміў Рацыі намесьнік старшыні Партыі БНФ Вінцук Вячорка, менавіта такая прамежкавая схема была прапанаваная падчас сустрэчы дэлегацыі ПАСЕ з лідэрамі дэмсіл:

- З іхняга гледжаньня можна было б весьці гаворку пра часовае аднаўленьне статусу спецыяльнага запрошанага пры ўмове зьмяшанага фармаваньня дэлегацыі Беларусі. У яе склад павінны ўвайсьці прадстаўнікі ўлады (відавочна, што гаворка ідзе пра Палату прадстаўнікоў) і дэмакратычных сілаў. Аднак, паводле інфармацыі, якую даў Андрэа Рыгоні, калі гэтая ідэя была прапанаваная спадару Батуры і спадарыні Пяткевіч, то ня сустрэла зь іхняга боку пазітыўнага водгуку.

Акрамя таго, падчас сустрэчы лідэры дэмакратычных сіл выказалі свае думкі наконт абвешчанай уладамі лібералізацыі. Як падкрэсьліў спадар Вячорка, тыя невялікія зрухі, якія назіраюцца ў Беларусі, накіраваныя на зьнешняга спажыўца. У той жа час ніякіх інстытуцыйных зьменаў у бок дэмакратыі ў краіне не адбываецца. Прыкладам гэтаму ёсць “брутальны разгон” мірных акцый апазіцыі 14 і 16 лютага, узбуджэньне крымінальных спраў супраць “ваўкавыскіх прадпрымальнікаў” – Мікалая Аўтуховіча, Юрыя Лявонава і Уладзіміра Асіпенкі, а таксама маладафронтаўца Арцёма Дубскага.

**Кастусь Вансяцкі**, Радыё Рацыя, Менск, 17 лютага 2009

## Беларускія дэмакраты будуць засядаць у Эўрапарламэнце

Беларусь на сходзе па Эўрапэйскім Усходнім суседстве будзе прадстаўляць апазіцыя, заявіў старшыня Камісіі па замежных справах Еўрапарламенту Яцэк Сарыюш-Вольскі.

Гэтую сэнсацыйную заяву еўрадэпутат зрабіў 26 лютага ў Брусэлі на сустрэчы з журналістамі, перадае «Еўрарадыё».

Як паведаміў дэпутат Еўрапарламенту, увосень падчас новай кадэнцыі Еўрапарламенту пачне працаваць сход Euronest (European Neighbourhood East - Эўрапэйскае суседства Усход). На ім будзе прысутнічаць 60 еўрапарламентароў і 60 парламентароў з усходніх краінаў па 10 з кожнай: тры каўказскія рэспублікі, Малдова, Украіна. І паколькі Еўразьвяз ня прызнае легітымнасьць беларускай «палаты прадстаўнікоў», на сход будуць запрошаныя прадстаўнікі беларускай апазіцыі.

Яцэк Сарыюш-Вольскі таксама заявіў, што сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі працягвае непакоіць міжнародную супольнасьць.

«Самым слабым элемэнтам гэтай «шасьцёркі» зьяўляецца Беларусь з сур'ёзным дэфіцытам дэмакратыі і правоў чалавека. Сёньня ёсць аптымістычныя зьмены, але не да канца. На жаль, закон аб СМІ пакуль супярэчыць эўрапэйскім стандартам. Таксама замест турмаў лідэраў апазіцыі адпраўляюць у армію», -- сказаў еўрадэпутат.

Сарыюш-Вольскі таксама паведаміў, што ў красавіку прадстаўнікі Еўрапарламенту плануюць прыехаць зь візітам у Менск. Дэпутаты плануюць сустрэцца з Аляксандрам Лукашэнкам, кіраўніком адміністрацыі прэзідэнта Уладзімірам Макеем, міністрам замежных справаў Сяргеем Мартынавым, а таксама кіраўніком руху «За Свабоду» Аляксандрам Мілінкевічам, старшынёй Беларускай асацыяцыі журналістаў Жанай Літвіной і іншымі прадстаўнікамі дэмакратычнага руху.

Падыходзіць да канца тэрмін часовага спыненьня дзеяньня санкцыяў у дачыненьні да беларускіх чыноўнікаў. Запланаваны візіт мае сваёй мэтай вырашыць далейшы лёс гэтых санкцыяў. Але сам Сарыюш-Вольскі ня верыць у канчатковую адмену санкцыяў.

«Мы менш за усіх зацікаўленыя ў бізнэсе і эканоміцы. Мы найбольш адчувальны да правоў чалавека і дэмакратыі орган у Еўразвязе. Я ня веру, што санкцыі могуць быць ліквідаваныя цалкам», -- сказаў дэпутат Еўрапарламента.

**Крыніца:** Хартыя 97, 28 лютага, 2009

# СПОРТ

## Вікторыя Азаранка выйграла буйны тэнісны турнір

19-гадовая беларуская тэнісістка Вікторыя Азаранка (10-е месца ў рэйтынгу) выйграла прэстыжны турнір у Маямі (ЗША) з прызавым фондам 4,5 млн. долараў. 4 красавіка ў фінальным матчы яна перамагла першую ракетку сьвету амерыканку Сэрэну Ўільямс — 6:3, 6:1.

В.Азаранка ўзяла пяць геймаў на падачы суперніцы, дазволіўшы ёй зрабіць тое ж самае толькі аднойчы. Тэнісісткі дапусьцілі 12 двайных памылак (сем — В.Азаранка, пяць — С.Ўільямс). Амэрыканка, якая выйшла на корт з забінтаваным левым бядром, змагалася да апошняга: пры ліку 1:5 у другім сэце яна двойчы мела магчымасьць узяць ачко на падачы беларускі.

На цырымоніі ўзнагароджання пасля матчу, які ў прамым эфіры перадаваў тэлеканал "Еўраспорт", С.Ўільямс падкрэсьліла, што забінтаванае бядро не павінна служыць апраўданьнем паражэння.

- Для мяне вялікае шчасце выйграць у Сэрэны. Для мяне гэта сапраўдная перамога. Сёлета я палепшыла сваю гульню і магу выйграваць на турнірах такога ўзроўню", — адзначыла В.Азаранка.

Дагэтуль беларуска і амэрыканка сустракаліся двойчы — на Адкрытым чэмпіянаце Аўстраліі. У 2008 годзе (1/16 фіналу) С.Ўільямс выйграла 6:3, 6:4, у 2009-м (1/8 фіналу) — 3:6, 4:2 (адмова В.Азаранкі з-за галавакружэньня і праблемаў са страўнікам).

С.Ўільямс выйграла турнір у Маямі пяць разоў: у 2002—2004, 2007 і 2008 гадох. Усяго на яе рахунку 33 тытулы ў адзіночным і 14 у парным разрадзе. В.Азаранка перамагла на трох турнірах у адзіночным разрадзе (у 2009 годзе ў Брысбэне, Мэмфісе і Маямі) і на трох — у парным (у 2006-м — у Ташкенце, у 2009-м — у Мемфісе і Індыян-Ўэлсе).

На шляху да фіналу ў Маямі В.Азаранка перамагла Анастасію Паўлючэнкаву (Расія, 27) — 6:2, 6:2, Ганну Чакветадзэ (Расія, 23) — 6:1, 6:4, Агнеш Саваі (Венгрыя, 25) — 6:2, 6:4, Саманту Стосур (Аўстралія, 42) — 6:1, 6:0 і Святлану Кузняцову (Расія, 8) — 6:3, 2:6, 7:5.



*Вікторыя Азаранка*

Сайт Жаночай тэніснай асацыяцыі інфармаваў пра перамогу беларускай спартсмэнкі загалоўкам "Зорка нарадзілася: Азаранка выйграла Маямі"

**Крыніца:** Радыё Рацыя, 5 красавіка 2009.

---

## Чэмпіёнка сьвету па боксе хоча адшукаць у Беларусі маці

28-гадовая чэмпіёнка сьвету па боксе сярод прафэсіяналаў, а апошнія дзесяць гадоў жыхарка нямецкага Штутгарту, Алеся Клімовіч–Граф заявіла журналістам, што большую частку яе жыцьця марыць знайсьці сваю маці, якую ні разу ня бачыла. Дзеля гэтага спартоўка зьбіраецца сёлета прыехаць у Беларусь.

“Я ня маю аніякага зла на гэтую жанчыну, напэўна ў яе былі нейкія сур’ёзныя прычыны для таго, каб адмовіцца ад мяне пры нараджэньні. Мне вельмі хочацца проста паразмаўляць зь ёй”, – сказала гэтымі днямі Алеся ў размове зь нямецкім выданьнем “Bild”.

За яе баі заўзятары называюць Алесю “тыгрыцай”, нягледзячы на тое, што яна мае вагу “супэрмухі”. Яна важыць 53 кіляграмы пры росьце 160 сантымэтраў. Алеся нарадзілася ў лістападзе 1980 году. Расла і выхоўвалася ў гомельскім дзіцячым доме. Зь дзяцінства захаплялася спортам, галоўным чынам лёгкай атлетыкай. Пасьля школы паступіла ў Гомельскі ўнівэрсытэт на спэцыяльнасьць фізычнае выхаваньне.

У 1999 годзе яна вырашае зьмяніць сваё жыцьцё і паехаць вучыцца ў Нямеччыну. У 2006 годзе стала чэмпіёнкай сьвету паводле Global Boxing Union (GBU). Вось ужо болей як два гады ўтрымлівае гэты тытул. Апошні раз пацьвердзіла яго пару дзён таму – 7 сакавіка.

Пасьля таго, як у 2002 годзе Алеся Клімовіч пабралася шлюбам зь нямецкім грамадзянінам, яна зьмяніла беларускае прозьвішча на нямецкае Граф. Пры канцы мінулага году Алеся Граф прыняла грамадзянства Нямеччыны. Увесь гэты час Алеся штогод наведвала Беларусь.

**Алена Струвэ,** SVAB, Радыё Рацыя

## У Таварыстве Беларускай Культуры ў Вільні адзначалі 91 угодкі БНР

*Усялякае паняволеньне пачынаецца з забароны мовы.*
*Ралан Барт*

28 сакавіка 2008 г. у Вільні ў Таварыстве Беларускай Культуры ў Літве адбылося сьвяткаваньне 91-годдзя Беларускай Народнай Рэспублікі. Яшчэ адна гадавіна разважаньняў і падсумаваньняў над пройдзеным шляхам, растаптанае, зьняважанае і ўкрыжаванае дзяржавы.

25 сакавіка было абвешчана аб нараджэньні новай дзяржавы. 25 сакавіка Анёл Габрыэль засьведчыў аб прыходзе на грэшную зямлю Божага Сына, таго, хто быў растаптаны, зьняважаны і укрыжаваны. А пасьля цераз цярністы шлях Божы Сын адрадзіўся да новага, слаўнага і велічнага жыцьця. І гэтыя паралелі часта наводзяць на думку аб адраджэньні нашае сьвятое Бацькаўшчыны. А пакуль Краіна 25 сакавіка ў XXI стагоддзі застаецца ў душах і сэрцах сваіх грамадзянаў і чакае свайго ўваскрашэньня.

У гэтае найвялікшае і радаснае нацыянальнае сьвята кожан раз са смуткам і болем даводзіцца канстатаваць, што Беларусь так і застаецца паняволенай дзяржавай: нішчыцца яе архаічная мова, культура, традыцыі, памяць, зьневажаецца ўсё, што беларускае. І гэтае ўсё робіцца пад маўклівую згоду саміх беларусаў, з памяці большасць якіх ужо выцертыя дзеі мінулага і галасы сваёй зямлі і заглушаныя акупацыйнымі. Таму большасьць ведае герояў не свае зямлі і ганарыцца чужымі, моліцца не сваім багам. Віры XX стагоддзя вельмі балюча прайшліся па Беларусі, якую практычна зруйнавалі дашчэнту. І яна павінна была б паўставаць з гэтых развалін, але ўкрыжаваны лёс працягваецца.

Але той 25 сакавік перамагае. Аб ім ужо ведаюць. І ён стаў ня толькі сьвятам беларускае эміграцыі, але вядомы і шырока адзначаецца і ў самой Бацькаўшчыне. І сёньня большасць сходзіцца на той думцы, што без Беларускай Народнай Рэспублікі ня было б і сёняшняй Беларусі. Тады, бальшавікі пайшлі на стварэньне БССР толькі таму, каб схіліць беларусаў на свой бок, прынамсі, іх раскалоць і ня даць магчымасьці беларусам аб'яднацца вакол БНР. Так было тады, так ёсьць сёньня...

Пасьля выкананьня нацянальнага гімну "Мы выйдзем шчыльнымі радамі", старшыня ТБК Хведар Нюнька зачытаў зварот Прэзыдэнта БНР Івонкі Сурвіллы да Беларускага народу.

На імпрэзе ў Таварыстве было шмат гасьцей, як з Літвы, так і з Беларусі. Ва ўсіх выступоўцаў гучалі словы занепакоенасьці сёняшняй сітуацыяй і надзеі на адраджэньне Беларусі і вяртаньне яе да нацыянальных і дэмакратычных каштоўнасьцяў.

Краіна згубленых мараў і ў той час краіна вялікай Надзеі – такой выглядае наша Сьвятая Бацькаўшчына.

Аб лёсе малавядомага беларускага каталіцкага сьвятара і паэта Казіміра Сваяка (кс. Кастуся Стэповіча) распавяла спадарыня Натальля Мяшкова. Ён быў адным з тых, хто спрычыніўся да Акту 25 сакавіка 1918 г. Так, ён ня прымаў у гэтым непасрэднага ўдзелу, але быў адным са стваральнікаў нацыянальнай ідэі беларусаў, за што шмат цярпеў ад польскага каталіцкага духавенства. Да канца сваіх дзён заставаўся верным сваім ідэалам і верыў у адраджэньне Беларусі. Ён спачывае ў Вільні на Росах разам са сваім братам Альбінам Стэповічам і шматлікімі беларусамі-віленчукамі, што пакінулі свой сьлед у гісторыі нашага народа. *Ідзе вось ясная пара / Праўду свеціць нам зара / Айчына, маці Беларусь, Гарой жыва!* Радкі зь яго верша, якія сталі эпітафіяй на ягоным надмагільным помніку.

На 10 гадавіну яго сьмерці паэт Міхась Машара напісаў верш, у якім не толькі словы ўдзячнасьці падзякі калегу і беларусу, але асэнсаваньне і ацэнка жыцьцёвага шляху Казіміра Сваяка:

*Я прыйшоў табе пакланіцца,*
*Рана змоўклы, наш слаўны паэт.*
*Ад ваколіцаў роднай зямліцы*
*Прынашу табе ціхі прывет.*
*Хоць ты змоўк і хоць ліра разьбіта,*
*І хоць новыя страты баляць –*
*Над краінай туманам спавітай*
*Тваіх песьняў акорды зьвіняць.*

Прыйдзе час і гэтае імя зойме належнае месца ў айчыннай гісторыі.

На сьвяткаваньне быў запрошаны Аляксандр Казулін, які падзяліўся сваімі думкамі адносна далейшага шляху Беларусі. Яго вельмі непакоіць тое, што адбываецца сёньня. Перадусім – паводзіны Эўропы да Лукашэнкі. Сёньня, калі ёсьць палітычныя вязьні, калі зьбіваюць дэманстрантаў, калі забараняюць беларусам адзначаць свае нацыянальныя сьвяты, Эўропа ня толькі маўчыць, але спрабуе легалізаваць гэты рэжым. Яна вядзе зь ім перамовы на фоне зьбіцьця моладзёвых актывістаў, часова прыпыняе санкцыі супраць чыноўнікаў і вось вось і запросіць Лукашэнку на саміт у Прагу. Наперадзе ідзе прагматызм і інтарэсы бізнэс-класу – так адзначыў прамоўца. Перамагае ня розум, а прагматызм. І праблема, відаць, ня ў Лукашэнку, а ў той сістэме, якую ён стварыў – у лукашызьме. І Эўропа сёньня яе прымае. І прыезд Лукашэнкі ў Прагу, гэта ня вырываньне яго з абдымкаў Расеі, а легалізацыя. І атрымліваецца, што за тыя 15 год дыктатуры, за зьніклых людзей, за зьбітых дэманстрантаў і вязьняў сумленьня ніхто не адкажа і на гэта закрыюць вочы. Спадар Аляксандр вельмі шкадаваў, што ў сёняшнім сьвеце замест сэрца і пачуцьцяў перамагае прагматызм. І прычыны сёняшняга крызісу не эканамічныя. Яны ў дэмаралізацыі грамадства, разбурэньні сямейных, сяброўскіх адносінаў, калі ўсё вымяраецца грашыма, а не духоўнасьцю. Спадара А. Казуліна вельмі непакоіць яшчэ і той факт, што беларуская апазіцыя ніяк не можа аб'яднацца і сесьці за стол перамоў, бо сёньня толькі разам можна перамагчы дыктатуру, адкінуць усе свае „я" і амбіцыі і рабіць агульную справу на карысьць Беларусі.

Аб адным з нацыянальных рамантыкаў і аб пошуку сваёй ідэнтычнасьці ў XIX ст. на прыкладзе Станіслава Манюшкі распавёў А. Фралоў. Чалавека XIX ст. цікавіла, а хто ён. І там пачынаўся пошук сябе і разуменьня сваёй тутэйшасьці. У Вільні ёсьць мэмарыяльная шыльда ў гонар С. Манюшкі як польскага кампазітара. І вось, як зазначыў прамоўца, побач зь ёй трэба і такую, што ён і беларускі кампазітар. І гэта зусім не азначае, што яго трэба адбіраць у палякаў, ці перайначваць гісторыю. Проста – ён яшчэ і беларускі кампазітар. Манюшка яшчэ да канца не знайшоў сябе, і ня гледзячы на тое, што вельмі шмат зрабіў для польскай музыкі, шмат зрабіў і для беларускай, якая гучыць у

яго матывах. Аб чым яшчэ адзначаў Рыгор Шырма, што слухаючы Манюшку, ён чуе галасы Меншчыны і Случчыны (адкуль быў родам кампазітар).

Лідэр Маладога Фронту З.Дашкевіч распавёў аб дзейнасьці гэтага моладзевага аб'яднаньня. Таксама і ў яго гучалі думкі занепакоенасьці склаўшайся сітуацыяй, аб тым што апазіцыя разьяднаная і, магчыма, прышоў час ёй зыйсьці ў адстаўку. Зусім ня шмат засталося сярод іх лідэраў, якім можна давяраць.

Спадар Р. Вайніцкі (кіраўнік клюбу „Сябрына"), які родам з м. Вішнева і быў ахрышчаны знакамітым беларускім ксяндзом У. Чарняўскім, зазначыў аб значнасьці для беларусаў сьвята 25 сакавіка, узгадаў віленскіх беларускіх „зуброў", якія дапамаглі яму стацца беларусам.

З найвялікшым беларускім нацыянальным сьвятам прысутных павіншаваў першы амбасадар Літоўскай Рэспублікі ў Беларусі Альфонс Аўгуліс. Ён ,між іншым, зазначыў, што беларусам сёньня трэба аб'яднацца і быць разам. Беларусы і літоўцы жылі заўжды побач, і сёньня часам цяжка адрозьніць, дзе літоўскае, дзе беларускае. Сёньня ня трэба дзяліцца, а быць разам. Трэба памятаць тое месца, дзе ты нарадзіўся і дзе ты жывеш і адносіцца да іх з павагай і любоўю. Суседзяў ,як і бацькоў, ня выбіраюць, яны даюцца. І літоўцы шчасьлівыя, што маюць побач такіх суседзяў, як беларусы.

Ад самакіраваньня г. Вільні павіншаваць беларусаў прыехала спадарыня Рэната Лісоўская-Урбановіч. Яна павіншавала са сьвятам і распавяла аб тым, як ідзе праца па стварэньню культурнага цэнтра Я. Коласа ў Павільні. Варта нагадаць, што ТБК і самакіраваньне г. Вільні выступілі заснавальнікамі ўзгаданага цэнтра.

Старшыня Рады Згуртаваньня беларусаў сьвету "Бацькаўшчына " Алена Макоўская выступаючы зазначыла, што сьвята 25 сакавіка неабходна было б пераводзіць з палітычнага кантэксту ў народны і адзначаць яго разам як нацыянальнае сьвята і не праводзіць у гэты час палітычныя акцыі. І вельмі добра, што ў дыяспарах яно адзначаецца як найвялікшае беларускае сьвята. Вельмі хацелася б, каб гэтак было і ў Беларусі.

Сп. Шыдлоўская распавяла аб падрыхтоўцы да V Зьезду беларусаў сьвету і аб тых праблемах, якія сустракаюцца. Вельмі прыкра, што ўлады ўсяляк гэтаму перашкаджаюць. Нават на сёняшні дзень ня знойдзена памешканьне для яго правядзеньня. А вельмі хацелася б, каб ён адбыўся ў Беларусі.

На заканчэньне бард Алесь Камоцкі агучыў свае творы, а вучаніца другой клясы школы Ф.Скарыны - Ксеня Мілаш парадавала ўсіх беларускімі песьнямі

На дадзены момант адна з самых актуальных праблемаў - гэта індэнтыфікацыя беларусаў, захаваньне іх нацыянальнай саматоеснасьці. Калі ідзе нахабная, і ўжо няпрыхаваная русіфікацыя, паўстае вострая праблема выжываньня нацыі. І супрацьстаяць ёй можна толькі разам, толькі аб'яднаўшыся. Гэта асноўная думка, якая гучала ў часе сьвяткаваньня чарговай гадавіны абвяшчэньня Беларускай Народнай Рэспублікі, нацыянальнай дзяржавы беларусаў, абвешчаныя ідэалы якой чакаюць свайго часу...

*Алесь Адамковіч*
*Вільня 30 сакавіка 2008 г.*

# РОЗНАЕ

## Беларуска-ліцьвінскія шахматы

1 красавіка 2009 году споўнілася 2 гады працы нашага сайту (http://nashaziamla.org). З гэтай нагоды хочацца зноў падаць сьветлы, каляровы матар'ял. Вось мы і вырашылі распавесьці пра беларуска-ліцьвінскія шахматы.

Пачнем з абвесткі. "Унікальная шахматная фігура — ладдзя, скрадзеная ў жніўні 2004 году з Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея, вернутая дзяржаве. Дзесяткі гадоў ладдзя XII стагоддзя часоў Полацкага княства лічылася знакам музея, упрыгожваючы экспазіцыю старажытнасьці" (паводле pahonia.org/str/2008-02/485.htm). Але сёньня мала хто ведае, што нашы далёкія продкі гулялі ў трохі іншыя шахматы.

**Па-першае**, дошка была не 64-клеткавай (8x8 клетак), а 81-клеткавай (9x9).

**Па-другое**, галоўнай фігурай, аналагічнай цяперашняму каролю, быў князь (на малюнку ўверсе абодва князі стаяць на белых палях 1e і 9e). Князь хадзіў, як кароль у цяперашніх шахах. Справа ад яго знаходзіўся гетман (1f і 9d), які хадзіў, як цяперашні ферзь-каралева. Зьлева ад князя быў княжыч (1d і 9f). Гэтая невядомая нам сёньня фігура пазначала старэйшага сына князя, які хадзіў, як князь – адзінае, што не на 1 клетку ва ўсе бакі, а на 1-2 клеткі. Справа ад гетмана знаходзіўся белапольны шляхціч (1g і 9c), які хадзіў як цяперашні белапольны афіцэр. Зьлева ад княжыча – коньнік (1c і 9g), фігура хадзіла, як цяперашні конь. Справа ад белапольнага шляхціча таксама быў коньнік (1h і 9b), а яшчэ правей – ладзьдзя (1i і 9a). Апошняя хадзіла, як цяперашняя тура-ладдзя. Зьлева ад коньніка княжыча быў чорнапольны шляхціч (1b і 9h), а яшчэ лявей – другая ладдзя. Шэрагі 2 і 8 займалі 9 ратнікаў.

**Па-трэцяе**, мэтай шахматнага спабору было ня столькі забойства галоўнай фігуры суперніка (мат каралю), колькі заняцьце трону князем. Тронам – сімвалам улады ва ўсім княстве – лічылася цэнтральная клетка (поле 5e) белага колеру з чырвонай гарызантальнай палоскай пасярэдзіне. Усё, што зьвязана з тронам, мела дадатковыя ўмовы:

- каб выйграць, яго павінен быў заняць князь, але не пад бой (г.зн, што ён павінен быў утрымацца на троне хаця б адзін чарговы ход суперніка). Тады гульня лічылася завершанай па адным з варыянтаў яе заканчэньня;

- пры жывым князі княжыч ня мог ступіць на трон;

- усе іншыя фігуры – гетман, шляхціч, ладзьдзя (за выключэньнем коньніка) – "з-за павагі да трону" не маглі яго праскокваць па гарызанталі, вертыкалі альбо дыяганалі, як яны маглі гэта рабіць ва ўсіх іншых выпадках. Яны павінныя былі затрымацца на троне, стаць на яго, калі ён быў на іх шляху, а затым рушыць далей.

**Чацьвертае.** Другім варыянтам завяршэньня гульні было забойства княскай сям'і – мат князю і княжычу. Але і тут быў адзін нюанс – калі быў мат князю, княжыч аўтаматычна станавіўся князем, гэтая абавязковая працэдура лічылася асобным ходам.

Яшчэ ў старажытных беларуска-ліцьвінскіх шахах (і гэта пятае) ня было ракіроўкі.

Рухі ратнікаў былі такімі ж, як у пешак у цяперашніх шахматах.

Заклікаю сёньняшніх грамадзян Беларусі адрадзіць нашыя шахі. Для гэтага дастаткова наклеіць на тыповую шахматную дошку дзьве картонкі (хаця ў ідэале дошку варта зрабіць з паступовым падвышэньнем вышыні клеткі, у кірунку ад перыферыі да цэнтру, з тым, каб "трон" быў самай высокай клеткай), пазначыць на іх чорныя ды белыя клеткі, "княскі трон" і зрабіць (ці знайсьці) 4 дадатковыя фігуры.

Калі вы пачнеце гуляць, вы пераканаецеся, што беларуска-ліцьвінская шахматная гульня, у адрозьненьне ад класічных індыйскіх шахмат, па-першае, нашмат больш гуманная (адмяняецца "забойства" як адзіная мэта), а, па-другое, нашмат больш адпавядае класічнай палітыцы, фармальная мэта якой – узяцьце і ўтрыманьне ўлады. Дый у цэлым, яны нашмат больш камбінатыўная, эмацыйная.

І апошняе.

Адзінае, што я з нагоды 1 красавіка не магу сказаць дакладна, дык гэта тое: ці гэта старажытныя нашы шахі, ці шахі нашае будучыні…

**Алесь Астроўскі, http://nashaziamla.org**




# Беларусы па ўсім сьвеце пачынаюць «пыхцець за Беларусь»

У эміграцкім асяродку беларусаў нарадзілася ідэя сумясьціць заняткі спортам і асьветніцкую дзейнасьць. Ініцыятары акцыі «**пыхцім за Беларусь!**» прапануюць беларусам па ўсім сьвеце заняцца ранішнімі прабежкамі, паралельна распавядаючы на камэру пра дзівосы тых мясьцінаў, дзе яны ўжо пабывалі.

Ідэя віртуальна бегаць разам нарадзілася ў **Сяргея Сматрычэнкі** (Вена) і **Тацяны Нядбай** (Люблін). Пасьля яе разьвіў літаратар **Віталь Воранаў**, які зараз жыве ў чэскім горадзе Брно. Віталь дадумаў назву акцыі і прапанаваў навяўленым бягуном дзяліцца ўражаньнямі празь Сеціва.

Як паведамляюць арганізатары, акцыю ўжо падтрымалі такія гарады, як Варшава, Вена, Брно, Люблін і Менск.

Так апісвае ў сваім дзёньніку матывацыю ўдзельнічаць у акцыі паэтка **Тацяна Нядбай**:

«Раней мы ў скайпе толькі бухалі, а потым дацямілі, што трэба гэта нечым ураўнаважыць (напрыклад, здаровым ладам жыцьця) і разнастаіць (напрыклад, культурнай праграмай), да таго ж, калі рэжым падзе, мы мусім быць у добрай фізычнай форме і ўсебакова (шматвэктарна) разьвітымі асобамі. А то раптам заўтра вайна, а ў нас вэктар толькі ў адзін бок паказвае».

Як адзначае Віталь Воранаў, галоўная фішка акцыі — «пасьля супольнай прабежкі паказаць, апавесьці сябром, што ты бачыў, па якой трасе бег, якое было надвор'е і што ўразіла. У выніку атрымліваецца, быццам вы сапраўды бегаеце разам. Апроч таго, бег становіцца ня толькі спортам, а яшчэ сацыяльным і пазнавальным мерапрыемствам».

«Нашы прабежкі ня маюць прымусовай формы: адзін чалавек можа прабегчы 500 мэтраў, а другі — трасу марафону. Галоўнае падзяліцца пасьля ўражаньнямі. Праз ЖЖ, ці іншую кантактную пляцоўку, на якой можна выкладаць фота, відэа, можна нават запісваць на дыктафон. Акрэсьленай формы няма, і ў гэтым увесь цымус ініцыятывы. Неакрэсьленасьць стымулюе крэатыўнасьць», — дадае Віталь Воранаў.

Віталь Воранаў ужо выклаў у Сеціве невялічкі аповед пра вілу Тугендгат у Чэхіі.

«Мы не чакаем, што акцыя выльлецца ў масы і заўтра па вуліцах Беларусі і замежжа будуць бегаць тысячы людзей з фотакамэрамі. Лепш гэта будзе меншая, але адданая і творчая група сяброў».

У час наступнай прабежкі Віталь Воранаў пляную забегчы ў замак Шпільбэрг ў Брно, а таксама да прорвы Мацоха.

«Усё, што пабачу я, пабачыце і вы», — абяцае літаратар.

Каб далучыцца да акцыі, яе ініцыятары прапануюць рабіць прабежкі па цікавых мясьцінах кожную нядзелю ў 7 гадзін цэнтральнаэўрапейскага часу (8 гадзін беларускага).

**Крыніца:** www. generation.by, 6 красавіка, 2009

**КРЫВІЯ - Культурна-асьветніцкая газэта**
Выданьне беларускай дыяспары ў Чэхіі
MK ČR E 16919

РЭДАКЦЫЯ
Юрка Станкевіч
Ганна Васілевіч

Адрас рэдакцыі:
ul. Ostrovského 253/3, 150 00 Praha 5
Тэл.: 774 613 356